*2.* Сацыяльна-педагагічныя аспекты дзейнасці бібліятэк Беларусі і іх кадравае забеспячэнне : манагр. / У. А. Акуліч [і інш.] ; навук. рэд. С. В. Зыгмантовіч, Н. У. Клімянкова ; М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск : БДУКМ, 2012. – 234 с.

**Н. В. Петухова,**
*выкладчык кафедры этналогіі і фальклору*

## КАМПЕТЭНТНАСНЫ ПАДЫХОД ДА ПАДРЫХТОЎКІ ФАЛЬКЛАРЫСТАЎ-ПРАКТЫКАЎ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сучасная вышэйшая прафесійная адукацыя характарызуецца новымі тэндэнцыямі, якія патрабуюць глыбокага пераасэнсавання падыходаў, тэхналогій і зместу падрыхтоўкі спецыялістаў. У прыватнасці, прапануецца выкарыстоўваць кампетэнтнасны падыход.

Кампетэнтнасны падыход у адукацыі мае сваю гісторыю. Яшчэ ў 60–70-я гг. ХХ ст. у ЗША і ў 70–80-я гг. ХХ ст. у Заходняй Еўропе сталі прымяняцца кампетэнтнасныя мадэлі навучання, якія разглядаліся ў кантэксце дзейнаснага падыходу. Іх мэтай была падрыхтоўка спецыялістаў-прафесіяналаў, здольных паспяхова канкурыраваць на рынку працы [1; 2; 3]. Такім чынам, кампетэнтнасны і дзейнасны падыходы ажыццявілі пераход ад парадыгмы тэарэтычных ведаў у адукацыі да дзейнаснай, арыентаванай на актуальныя і запатрабаваныя жыццём практычныя вынікі навучання.

Праблемы кампетэнтнаснага падыходу аналізуюцца ў працах сучасных даследчыкаў В. І. Байдэнкі, У. А. Болатава, І. А. Зімняй, Г. К. Кавалёва, Ю. Г. Татура, І. Д. Фруміна, С. Я. Шышова і інш.

Згодна з А. В. Хутарскім, кампетэнтнасны падыход забяспечвае «цэласны вопыт вырашэння жыццёвых праблем, выкананне ключавых (якія адносяцца да многіх сацыяльных сфер) функцый, сацыяльных роляў, кампетэнцый, пры гэтым прадметнае веданне не знікае са структуры адукаванасці, а выконвае ў ёй падпарадкаваную ролю» [4, с. 58].

Кампетэнтнасны падыход акцэнтуе ўвагу на выніку адукацыі, у якасці якога разглядаецца не сума засвоенай інфармацыі, а здольнасць чалавека дзейнічаць у розных сітуацыях. Пры гэтым на першы план вылучаецца не тэарэтычнае інфармаванне

студэнта, а уменне вырашаць практычныя задачы ў будучай прафесійнай дзейнасці.

На наш погляд, для развіцця дадзенага ўменння вялікае значэнне мае практычная падрыхтоўка будучых фалькларыстаў-практыкаў, якая складаецца з наступных этапаў: экспедыцыйны, вучэбна-азнаямленчы, педагагічны, кваліфікацыйны.

Першы этап − экспедыцыйная практыка. На дадзеным этапе адбываецца асэнсаванне студэнтамі будучай прафесійнай дзейнасці. Яны вучацца прымяняць атрыманыя на лекцыях навукова-тэарэтычныя веды па арганізацыі фальклорных экспедыцый, авалодваюць спосабамі і прыёмамі фіксацыі матэрыялаў, а таксама іх аналізам і сістэматызацыяй.

На другім, вучэбна-азнаямленчым этапе студэнты наведваюць адкрытыя заняткі ў фальклорных калектывах, агляды і конкурсы, майстар-класы вядучых спецыялістаў у галіне народнай творчасці з наступным абмеркаваннем і аналізам. Дадзены этап прысвечаны вывучэнню спецыфікі арганізацыі фальклорнай творчасці ва ўстановах дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, авалоданню метадычнымі сродкамі этнакультурнай адукацыі і этнамастацкай дзейнасці. Такім чынам студэнты высвятляюць асаблівасці працы педагога, дзейнасць якога падпарадкавана ўключэнню асобы ў атмасферу этнакультурных каштоўнасцей.

Трэці этап − педагагічная практыка. На дадзеным этапе студэнты далучаюцца да этнакультурнай педагагічнай дзейнасці, якая ажыццяўляецца на аснове актыўнай арганізацыйнай працы з дзецьмі і моладдзю ў фальклорных калектывах. Студэнты вучацца працаваць з вучэбнымі планамі і праграмамі, метадычнымі рэкамендацыямі па арганізацыі працэсу навучання і выхавання сродкамі народнай творчасці; планаваць працэс навучання і выхавання ў адпаведнасці з распрацаванымі нарматыўнымі і дыдактычнымі дакументамі; падбіраць рэпертуар, арганізоўваць справаздачныя заняткі ў форме творчых паказаў, канцэртаў, тэатральных спектакляў і інш.

Чацвёрты этап − кваліфікацыйны. На дадзеным этапе ажыццяўляецца пераддыпломная практыка студэнтаў, якая з'яўляецца асновай першапачатковага прафесійнага вопыту і гатоўнасці будучага спецыяліста да самастойнай працоўнай дзейнасці. Студэнты вучацца планаваць асноўныя этапы навуковых даследаванняў народнай творчасці; аналізаваць напрамкі заха-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вання і развіцця народнай творчасці; ажыццяўляць нагляд за бытаваннем розных відаў і жанраў народнай творчасці ў мэтах іх аховы, пераемнасці і інш.

На наш погляд, рэалізацыі кампетэнтнаснага падыходу да падрыхтоўкі фалькларыстаў-практыкаў спрыяе практычная дзейнасць студэнтаў, якая складаецца з экспедыцыйнага, вучэбна-азнаямленчага, педагагічнага і кваліфікацыйнага этапаў.


1. *Болотов, В. А.* Компетентностная модель: от идеи к образовательной парадигме / В. А. Болотов, В. В. Сериков // Педагогика. – 2003. – № 10. – С. 8–14.

2. *Зеер, Э. Ф.* Модернизация профессионального образования. Компетентностный подход : учеб. пособие / Э. Ф. Зеер, А. М. Павлова, Э. Э. Симанюк. – М. : Моск. психолого-социальный ин-т, 2005. – 216 с.

3. *Кульменева, Л. Г.* Компетентностный подход к современному образованию / Л. Г. Кульменева // Нар. асвета. – 2012. – № 10. – С. 37–41.

4. *Хуторской, А. В.* Компетентностный подход в обучении : науч.-метод. пособие / А. В. Хуторской. – М. : Эйдос, 2013. – 73 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ